# КНІГА ПРАРОКА АСІІ

1 Слова Гасподняе, якое было да Асіі, сына
Бээрыінавага, у дні Азіі, Ёатама, Ахаза, Эзэкіі, цароў
Юдэйскіх, і ў дні Ераваама, сына Ёасавага, цара
Ізраільскага.
2 Пачатак слова Гасподняга Асію. І сказаў
Гасподзь Асію: «ідзі, вазьмі сабе жонку блудніцу і
дзяцей блуду; бо моцна блудадзеіць зямля гэтая,
адступіўшыся ад Госпада».
3 І пайшоў ён і ўзяў Гомер, дачку Дыўлаіма; і яна
зачала і нарадзіла яму сына.
4 І Гасподзь сказаў яму: «дай яму імя Ізрэель, бо яшчэ
крыху пройдзе, і Я спаганю кроў Ізраіля з дому Іуевага
і пакладу канец царству дому Ізраілевага,
5 і будзе ў той дзень, Я зламаю лук Ізраілеў у даліне
Ізрэель».
6 І зачала яшчэ і нарадзіла дачку, і Ён сказаў яму: «дай
ёй імя Ларухама; бо я ўжо ня буду больш літаваць
дому Ізраілевага, каб дараваць ім.
7 І дом Юдаў умілажалю і ўратую іх у Госпадзе Богу
іхнім, уратую іх ня лукам, ня мечам, не вайною, ня
конямі і вершнікамі».
8 І выкарміўшы грудзьмі Непамілаваную, яна зачала і
нарадзіла сына.
9 І сказаў Ён: «дай яму імя Лаамі, бо вы - ня Мой народ,
і Я ня буду вашым Богам.
10 Але будзе лік сыноў Ізраілевых як пясок марскі,
якога нельга ні вымераць, ні палічыць; і там, дзе
казалі ім: вы ня Мой народ, будуць казаць ім: вы сыны
Бога жывога.

11 І зьбяруцца сыны Юдавыя і сыны Ізраілевыя разам
і паставяць сабе адну галаву і выйдуць зь зямлі
перасяленьня; бо вялікі дзень Ізрэеля!

# Ac 2

1 Кажэце братам вашым: Мой народ, і сёстрам вашым:
Памілаваная.
2 Судзецеся з вашаю маці, судзецеся; бо яна ня жонка
Мая, і Я ня сужэнец яе; хай яна адвядзе блуд ад аблічча
свайго і пералюб ад грудзей сваіх,
3 каб я не разьдзеў яе дагала і ня выставіў яе, як
у дзень нараджэньня яе, не зрабіў яе пустэльняю,
не ператварыў яе ў зямлю сухую і ня выснадзіў яе
смагаю.
4 І дзяцей яе не памілую, бо яны дзеці блуду.
5 Бо блудадзейнічала маці іхняя і асарамаціла сябе
тая, што зачала іх; бо казала: пайду за палюбоўнікамі
маімі, якія даюць мне хлеб і ваду, воўну і лён, алей і
пітво.
6 За тое вось Я загараджу дарогу яе цернямі і
абгараджу яе плотам і яна ня знойдзе сьцежак сваіх,
7 і пагоніцца за палюбоўнікамі сваімі, але не здагоніць
іх, і будзе шукаць іх, але ня знойдзе і скажа: пайду я і
вярнуся да першага мужа майго; бо тады лепей было
мне, чым цяпер.
8 А ня ведала яна, што Я, Я даваў ёй хлеб і віно і алей і
памножыў у яе срэбра і золата, зь якога зрабілі ідала
Ваала.
9 За тое Я вазьму назад хлеб Мой у ягоны час і віно Маё
ў яго пару і адбяру воўну і лён Мой, чым пакрываецца
галізна яе.
10 І сёньня адкрыю сарамату яе перад вачыма
палюбоўнікаў яе, і ніхто ня вырве яе з рукі Маёй.
11 І спыню ў яе ўсякую весялосьць, сьвяты яе і
навамесяцы яе, і суботы яе і ўсе ўрачыстасьці яе.

12 І спустошу вінаградныя лозы яе і смакоўніцы яе,
пра якія яна кажа: гэта ў мяне дарункі, якіх надарылі
мне палюбоўнікі мае; і Я ператвару іх у лес, і палявыя
зьвяры зьядуць іх.

13 І пакараю яе за дні служэньня Ваалам, калі
яна кадзіла ім і, упрыгожыўшы сябе завушніцамі і
пацеркамі, хадзіла за палюбоўнікамі сваімі, а Мяне
забывала, кажа Гасподзь.

14 Таму вось, і я панаджу яе, прывяду яе ў пустэльню
і буду гаварыць у сэрца яе.

15 І дам ёй адтуль вінаграднікі яе і даліну Ахор,
напярэдадні надзеі; і яна будзе сьпяваць там, як у дні
маладосьці сваёй і як у дзень выйсьця свайго зь зямлі
Егіпецкай.

16 І будзе ў той дзень, кажа Гасподзь, ты будзеш зваць
Мяне: муж мой, і ня будзеш больш зваць Мяне: Ваале.

17 І адвяду імёны Ваалаў ад вуснаў яе, і ня будуць
болей згадвацца імёны іхнія.

18 І ўчыню тым часам ім згоду з польнымі зьвярамі і
з птушкамі нябеснымі і з паўзунамі наземнымі; і лук,
і меч, і вайну вынішчу зь зямлі той, і дам ім жыць у
бясьпецы.

19 І заручу цябе Мне навек, і заручу цябе Мне ў праўдзе
і судзе, у даброці і міласэрнасьці,

20 і заручу цябе Мне ў вернасьці, і ты спазнаеш
Госпада.

21 І будзе ў той дзень, Я пачую, кажа Гасподзь, пачую
неба, і яно пачуе зямлю,

22 і зямля пачуе хлеб і віно і алей; а гэтыя пачуюць
Ізрэель.

23 І пасею яе Сабе на зямлі і скажу і памілую
Непамілаваную і скажу не Майму народу: «ты - Мой
народ», а ён скажа: «Ты - мой Бог!»

# Ac 3

1 I сказаў мне Гасподзь: «ідзі яшчэ і пакахай
жанчыну, каханую мужам, але пералюбніцу, падобна
таму, як любіць Гасподзь сыноў Ізраілевых, а яны
паварочваюцца да іншых багоў і любяць вінаградныя
ляпёшкі іхнія».
2 I набыў я яе сабе за пятнаццаць срэбранікаў і за
хомер ячменю
3 і сказаў ёй: «шмат дзён заставайся ў мяне; не
блудадзейнічай і ня будзь зь іншым; і я таксама буду
для цябе.
4 Бо доўгі час сыны Ізраілевыя будуць заставацца без
цара і бяз князя і без ахвяры, без ахвярніка, бяз эфода
і тэрафіма.
5 Пасьля гэтага навернуцца сыны Ізраілевыя і
знойдуць Госпада Бога свайго і Давіда, цара свайго,
і будуць богабаязныя перад Госпадам і даброцьцю
Ягонай у апошнія дні».

# Ac 4

1 Слухайце слова Гасподняе, сыны Ізраілевыя; бо суд
у Госпада з жыхарамі гэтай зямлі, бо няма ні праўды,
ні міласэрнасьці, ні Богаспазнаньня на зямлі.
2 Прысяга і падман, забойства і крадзёж і
пералюбнасьць вельмі пашырыліся, і праліцьцё крыві
ідзе сьледам за праліцьцём крыві.
3 За гэта заплача зямля гэтая і змогуцца ўсе, хто жыве
на ёй, са зьвярамі польнымі і птушкамі нябеснымі,
нават і рыбы марскія загінуць.
4 Але ніхто не спрачайся, ніхто не выкрывай другога;
і твой народ - як тыя, што спрачаюцца са сьвятаром.
5 I ты загінеш удзень, і прарок загіне з табою ўначы, і
зьнішчу маці тваю.

6 Вынішчаны будзе народ Мой празь недахоп
выданьня: як што ты адкінуў веданьні, дык і я адкіну
цябе ад сьвяшчэнадзейства перада Мною; і як ты
забыў закон Бога твайго, дык і Я забуду дзяцей тваіх.
7 Чым болей яны памнажаюцца, тым болей грэшаць
супроць Мяне; славу іхнюю абярну ў няславу.
8 Грахамі народу Майго кормяцца яны, і да
беззаконьня яго імкнецца душа іхняя.
9 І што будзе з народам, тое і са сьвятаром; і пакараю
яго паводле шляхоў ягоных і аддам яму паводле
ўчынкаў ягоных.
10 Будуць есьці - і не насыцяцца; будуць
блудадзейнічаць - і не размножацца, бо пакінулі
служэньні Госпаду.
11 Блуд, віно і напоі завалодалі сэрцам іхнім.
12 Народ Мой пытаецца ў свайго дрэва, і жазло ягонае
дае яму адказ; бо дух блуду ўвёў іх у аблуду, і
блудадзейнічаючы, яны адступіліся ад Бога свайго.
13 На вяршынях гор яны прыносяць ахвяры і на
пагорках кадзяць пад дубам і таполяй і тэрафімам, бо
добры ад іх цень; таму любадзейнічаюць дочкі вашыя,
і пералюбы чыняць нявесткі вашыя.
14 Я пакіну караць дочак вашых, калі яны
блудадзейнічаюць, а нявестак вашых, калі яны
пералюбы чыняць, бо вы самыя - на баку блудадзеек
і зь любадзейкамі прыносіце ахвяры, а невук-народ
гіне.
15 Калі ты, Ізраіле, блудадзейнічаеш, дык хай бы не
грашыў Юда; і не хадзеце ў Галгал і ня ўзыходзьце ў
Бэт-Авэн і не бажэцеся: жывы Гасподзь!
16 Бо як упартае цяля, упарты стаў Ізраіль; ці будзе
цяпер Гасподзь пасьвіць іх, як ягнят на шырокай
пашы?!
17 Прывязаўся да ідалаў Яфрэм; пакінь яго!

18 Агіднае п'янства іх, зусім аддаліся блудадзейству; князі іхнія любяць сараматнае.
19 Ахопіць іх вецер сваімі крыламі, і пасаромеюцца яны ахвяраў сваіх.

# Ас 5

1 Слухайце гэта, сьвятары, і ўважайце, дом Ізраілеў, і
прыхілеце вуха, дом цара; бо вам будзе суд, бо вы былі пасткаю ў Масіфе і сеткаю, раскінутаю ў Таворы.
2 Глыбока заграэлі ў распусьце яны; але Я пакараю ўсіх іх.
3 Яфрэма Я ведаю, і Ізраіль не схаваны ад Мяне; бо ты блудадзейнічаеш, Яфрэме, і Ізраіль апаганіўся.
4 Справы іхнія не дазваляюць ім зьвярнуцца да Бога свайго, бо дух распусты ўсярэдзіне ў іх, і Госпада яны не спазналі.
5 І гонар Ізраілеў прыніжаны ў вачах у іх; і Ізраіль і Яфрэм загінуць ад бязбожнасьці сваёй; упадзе і Юда зь імі.
6 З авечкамі сваімі пойдуць шукаць Госпада і ня знойдуць Яго: Ён адыдзе ад іх.
7 Госпаду яны здрадзілі, бо нарадзілі чужых дзяцей; сёньня новы месяц зьесьць іх зь іхняй маёмасьцю.
8 Затрубеце рогам у Гіне, трубою ў Раме; узвышайце голас у Бэтавэме: за табою, Веньяміне!
9 Яфрэм зробіцца пустэльняю ў дзень пакараньня; паміж плямёнамі Ізраілевымі Я ўзьвясьціў гэта.
10 Правадыры Юдавы сталі падобнымі на тых, што перасоўваюць межы: вылью на іх гнеў Мой, як ваду.
11 Прыгнечаны Яфрэм, уражаны судом; бо захацеў хадзіць сьледам за марнымі.
12 І буду як моль Яфрэму і як чарвяк дому Юдаваму.
13 І ўбачыў Яфрэм хваробу сваю і Юда - сваю рану, і
пайшоў Яфрэм да Асура і паслаў да цара Ярэва; але ён

ня можа ацаліць вас, і ня вылечыць вас ад раны.
14 Бо Я як леў Яфрэму і як ільвяня дому Юдаваму; Я, Я
разарву і пайду; панясу - і ніхто ня выратуе.
15 Пайду, вярнуся ў Маё месца, пакуль яны ня
прызнаюць сябе вінаватымі і ня знойдуць абліччa
Майго.

# Ас 6

1 У скрусе сваёй яны з раньняга рана будуць шукаць
Мяне і казаць: хадзем і вернемся да Госпада! бо Ён
параніў - і Ён ацаліць нас, уразіў - і перавяжа нашыя
раны;
2 ажывіць нас праз два дні, на трэці дзень паставіць
нас, і мы будзем жыць перад абліччам Яго.
3 Дык вось, спазнаем, будзем імкнуцца спазнаць
Госпада; як ранішняя зара - зьяўленьні Яго, і Ён
прыйдзе да нас як дождж, як позьні дождж абросіць
зямлю.
4 Што зраблю табе, Яфрэме? што зраблю табе, Юдзе?
пабожнасьць вашая як ранішні туман і як раса, хутка
зьнікомая.
5 Таму Я ўражваў праз прарокаў і біў іх словамі вуснаў
Маіх, і суд Мой як узыходнае сьвятло.
6 Бо Я міласьці хачу, а не ахвяры, і Богаведаньня
болей, чым усеспаленьняў.
7 А яны, падобна Адаму, парушылі запавет і там
здрадзілі Мне.
8 Галаад - горад бязбожнікаў, запэцканы крывёю.
9 Як рабаўнікі высочваюць чалавека, так зборню
сьвятароў забіваюць на дарозе ў Сіхем і ўчыняюць
мярзоты.
10 У доме Ізраіля Я бачу жудаснае; там блудадзейства
ў Яфрэма, апаганіўся Ізраіль.

11 І табе, Юдзе, вызначана жніво, калі Я вярну палон
народу Майго.

# Ac 7

1 Калі Я лекаваў Ізраіля, адкрылася няпраўда
Яфрэмава і зладзейства Самарыі; бо яны паводзяцца
ілжыва; і ўваходзіць злодзей, і разбойнік рабуе на
вуліцах.
2 Ня думаюць яны ў сэрцы сваім, што Я памятаю ўсе
ліхадзействы іхнія; цяпер вакол іх учынкі іхнія; яны -
перад абліччам Маім.
3 Ліхадзействам сваім яны вяселяць цара і падманамі
сваімі - князёў.
4 Усе яны палаюць пералюбствам, як печ, напаленая
пекарам, які перастае паліць яе, калі замесіць цеста і
яно ўкісьне.
5 «Дзень нашага цара!» кажуць князі, разгарачаныя
да хваробы віном, а ён працягвае руку сваю да
блюзьнераў.
6 Бо яны хітрынай сваёю робяць сэрца сваё падобным
да печы: пекар іхні сьпіць усю ноч, а раніцай яна
гарыць як палымяны агонь.
7 Усе яны распалены, як печ, і пажыраюць судзьдзяў
сваіх; усе цары іхнія падаюць, і ніхто зь іх не
зьвяртаецца да Мяне.
8 Яфрэм зьмяшаўся з народамі, Яфрэм стаў як
непавернуты хлеб.
9 Чужыя пажыралі сілу ягоную, - і ён не заўважаў;
сівізна пакрыла яго, а ён ня ведае.
10 І гонар Ізраіля прыніжаны ў вачах іхніх, - і пры ўсім
гэтым яны не зьвярнуліся да Госпада Бога свайго і не
знайшлі Яго.
11 І зрабіўся Яфрэм, як дурны голуб, бяз сэрца:
клічуць Егіпцянаў, ідуць у Асірыю.

12 Калі яны пойдуць, Я закіну на іх сетку Маю; як
птушак нябесных скіну іх; пакараю іх, як чула зборня
іхняя.
13 Гора ім, што яны адышлі ад Мяне; пагібель ім, што
яны адпаліся ад Мяне! Я ратаваў іх, а яны ілжу казалі
на Мяне.
14 І не зьвярталіся да Мяне сэрцам сваім, калі галасілі
на ложках сваіх; зьбіраюцца дзеля хлеба і віна, а ад
Мяне аддаляюцца.
15 Я наводзіў іх на розум, а яны намышлялі ліхое
супроць Мяне.
16 Яны зьвярталіся, але не да Ўсявышняга, зрабіліся -
як ненадзейны лук; загінуць ад меча князя іхняга за
дзёрзкасьць языка свайго; гэта будзе пасьмяяньне зь
іх у зямлі Егіпецкай.

# Ac 8

1 Трубу да вуснаў тваіх! Як арол наляціць на дом
Гасподні за тое, што яны парушылі запавет Мой і
пераступілі закон Мой!
2 Мяне будуць заклікаць: «Божа мой! мы спазналі
Цябе, мы - Ізраіль».
3 Адкінуў Ізраіль добрае; вораг будзе перасьледаваць
яго.
4 Пастаўлялі цароў самыя, безь Мяне; ставілі князёў,
але без Майго ведаму; з срэбра свайго і золата свайго
рабілі сабе ідалаў: адтуль - пагібель.
5 Пакінула цябе цяля тваё, Самарыя! запалаў гнеў
Мой на іх; дакуль ня могуць яны ачысьціцца?
6 Бо і ён - справа Ізраіля. Мастак зрабіў яго, і таму ён -
ня бог; у кавалкі ператворыцца цяля Самарыйскае!
7 Як што яны сеялі вецер, дык і пажнуць буру: хлеба
на корані ня будзе ў яго, зерне ня дасьць мукі, а калі і
дасьць, дык чужыя праглынуць яе.

8 Праглынуты Ізраіль; цяпер яны будуць сярод
народаў як няпрыдатны посуд.
9 Яны пайшлі да Асура; як дзікі асёл, адзінокі бадзяга,
Яфрэм здабываў добрую прыхільнасьць да сябе.
10 Хоць яны і пасылалі дарункі народам, але неўзабаве
Я зьбяру іх, і яны пачнуць пакутаваць ад цяжару цара
князёў;
11 бо шмат ахвярнікаў набудаваў Яфрэм дзеля грэху,
- у грэх паслужыліся яму гэтыя ахвярнікі.
12 Напісаў Я яму важныя законы Мае, але яны
палічаны ім як бы чужыя.
13 У ахвярапрынашэньнях Мне яны прыносяць мяса
і ядуць яго; Госпаду не да спадобы яны; сёньня Ён
згадае бязбожнасьць іхнюю і пакарае іх за грахі іхнія:
яны вернуцца ў Егіпет.
14 Забыў Ізраіль Садзецеля свайго і зладзіў капішчы,
і Юда набудаваў шмат умацаваных гарадоў; але Я
пашлю агонь на гарады яго, - і зжарэ харомы ягоныя.

# Ас 9

1 Ня радуйся, Ізраіле, да захапленьня, як іншыя
народы, бо ты блудадзейнічаеш, аддаліўшыся ад Бога
твайго: любіш блудадзейныя дарункі на ўсіх гумнах.
2 Гумно і чавільня ня будзе карміць іх, і надзея на
вінаградны сок ашукае іх.
3 Ня будуць яны жыць на зямлі Гасподняй: Яфрэм
вернецца ў Егіпет, і ў Асірыі будуць есьці нячыстае.
4 Ня будуць ліць Госпаду віна, і не да спадобы
Яму будуць ахвяры іхнія; яны будуць ім, як хлеб
хаўтурны: усе, што будуць есьці яго, апаганяцца, бо
хлеб іхні - для душы іхняй, а ў дом Гасподні ён ня
ўвойдзе.
5 Што рабіцьмеце ў дзень урачыстасьці і ў дзень сьвята
Гасподняга?

6 Бо вось, яны сыдуць з прычыны спусташэньня;
Егіпет зьбярэ іх, Мэмфіс пахавае іх; каштоўнасьцямі
іх з срэбра завалодае крапіва, калючае церне будзе ў
намётах іхніх.
7 Прыйшлі дні наведваньня, прыйшлі дні аддачы.
Хай жа ўведае Ізраіль, што дурны прадказальнік, бяз
розуму той, хто выдае сябе за натхнёнага, з прычыны
мноства беззаконьняў тваіх і вялікай варожасьці!
8 Яфрэм - вартаўнік каля Бога майго; прарок - сетка
птушкалова на ўсіх дарогах ягоных; змуста - у доме
Бога ягонага.
9 Глыбока ўпалі яны, разбэсьціліся, як за дзён Гівы;
Ён успомніў бязбожнасьць іхнюю, пакарае іх за грахі
іхнія.
10 Як вінаград у пустыні, Я знайшоў Ізраіля; як
першую ягадзіну на смакоўніцы, у першы час яе,
убачыў я бацькоў вашых, - але яны пайшлі да
Ваалфэгора і аддаліся ганебшчыне, і самі зрабіліся
мярзотнымі, як тыя, якіх палюбілі.
11 У Яфрэмлянаў, як птушка, паляціць слава: ні
нараджэньня, ні цяжарнасьці, ні зачацьця.
12 А хоць бы яны і выхавалі дзяцей сваіх, адбяруць іх;
бо гора ім, калі адыду ад іх!
13 Яфрэм, як Я бачыў яго да Тыра, пасаджаны на
цудоўнай мясцовасьці; аднак Яфрэм выведзе дзяцей
сваіх да забойцы.
14 Дай ім, Госпадзе... што Ты дасі ім? Дай ім вантробу
няплодную і сухія саскі.
15 Усё ліха іхняе - у Галгале: там Я зьненавідзеў іх за
ліхія дзеі іхнія; выганю іх з дома Майго, ня буду болей
любіць іх; усе князі іхнія - адступнікі.
16 Пабіты Яфрэм; высах корань іх, - ня будуць
прыносіць яны плоду, а калі і будуць радзіць, Я
ўсьмерчу пахацінскі плод нутрыны іхняй.

17 Адкіне іх Бог мой, бо яны не паслухаліся Яго, - і
будуць валацугамі паміж народамі.

# Ас 10

1 Ізраіль - галінасты вінаград, памнажае сабе плод;
чым болей у яго пладоў, тым болей памнажае
ахвярнікі; чым лепшая зямля ў яго, тым болей
упрыгожваюць яны куміраў.
2 Падзялілася сэрца іхняе, за гэта яны і будуць
пакараныя: Ён разбурыць ахвярнікі іхнія, скрышыць
куміраў іхніх.
3 Цяпер яны кажуць: «няма ў нас цара, бо мы не
збаяліся - Госпада! а цар - што нам зробіць?»
4 Кажуць словы пустыя, божацца ілжыва, заключаюць
пагадненьні; за гэта явіцца суд над імі, як атрутная
трава на барознах поля.
5 За цяля Бэт-Авэна затрымцяць жыхары Самарыі;
заплача па ім народ, і жрацы яго, што радаваліся за
яго, будуць плакаць па славе ягонай, бо яна адыдзе ад
яго.
6 А сам ён аднесены будзе ў Асірыю - у дарунак
цару Ярэву; пасаромлены будзе Яфрэм, і пасароміцца
Ізраіль ад намыслу свайго.
7 Зьнікне ў Самарыі цар яе - як шум на паверхні вады.
8 І вынішчаны будуць вышыні Авэна - за грэх Ізраіля;
церне і ваўчкі вырастуць на ахвярніках іхніх, і
скажуць яны горам: «пакрыйце нас», і пагоркам:
«упадзеце на нас!»
9 Больш, чым у дні Гівы, грашыў ты, Ізраіле; там яны
ўстоялі; вайна ў Гаваоне супроць сыноў бязбожнасьці
не спасьцігла іх.
10 Паводле жаданьня Майго пакараю іх, - і зьбяруцца
супроць іх народы, і яны будуць зьвязаныя за двайное
злачынства іхняе.

11 Яфрэм - навучанае цяля, прывычнае да малацьбы, і
Я сам, пакладу ярмо на тлустую шыю яго; на Яфрэме
будуць вярхом езьдзіць, Юда будзе араць, Якаў будзе
баранаваць.
12 Сейце ў сабе праўду - і пажняце міласьць;
разворвайце ў сябе навіну, бо час - знайсьці Госпада,
каб Ён, калі прыйдзе, дажджом выліў на вас праўду.
13 Вы ўраблялі беззаконьні, ясьце плод ілжы, бо ты
спадзяваўся на шлях твой, на мноства ваяроў тваіх.
14 І адбудзецца розрух у народзе тваім, і ўсе цьвярдыні
твае будуць разбураныя, як Салман разбурыў Бэт-
Арбэл у дзень бітвы: маці была забітая зь дзецьмі.
15 Вось, што ўчыніў вам Вэтыль за край бязбожнасьці
вашай.

# Ac 11

1 І на золку загіне цар Ізраілеў! Калі Ізраіль быў
малады, Я любіў яго і зь Егіпта выклікаў сына Майго.
2 Клікалі іх, а яны ішлі прэч ад аблічча іх; прыносілі
ахвяру Ваалам і кадзілі ідалам.
3 Я Сам прывучаў Яфрэма хадзіць, насіў яго на руках
Сваіх, а яны не ўсьведамлялі, што я лекаваў іх.
4 Путамі чалавечымі цягнуў Я іх, путамі любові, і быў
ім як бы тым, хто падымае ярмо са сківіцаў іхніх, і
ласкава падкладваў ежу ім.
5 Ня вернецца ён у Егіпет; але Асур - ён будзе царом
яго, бо яны не схацелі зьвярнуцца да Мяне.
6 І ўпадзе меч на гарады яго - і зьнішчыць замкі ягоныя
і зжарэ іх за намыслы іхнія.
7 Народ Мой закасьцянеў у адпадзеньні ад Мяне, хоць
і заклікаюць яго да вышэйшага, ён не ўзвышаецца
аднадушна.
8 Што зраблю з табою, Яфрэме? як здраджу табе,
Ізраіле? Ці зраблю з табою, як з Адамам, ці зраблю

табе, як Сэваіму? Павярнулася ўва Мне сэрца Маё,
загарэлася шкадоба Мая!
9 Не зраблю паводле лютасьці гневу Майго, ня зьнішчу
Яфрэма, бо Я - Бог, а не чалавек; сярод цябе - Сьвяты;
Я не ўвайду ў горад.
10 Сьледам за Госпадам пойдуць яны. Як леў, Ён
дасьць голас Свой; дасьць голас Свой, - страпянуцца
да Яго сыны з захаду,
11 страпянуцца зь Егіпта як птушкі, і зь зямлі
Асірыйскай, як галубы; і ўсялю іх у дамы іхнія, кажа
Гасподзь.
12 Акружыць Мяне Яфрэм манаю і дом Ізраілеў -
хітрынаю; Юда трымаўся яшчэ Бога і верны быў са
сьвятымі.

# Ас 12

1 Яфрэм пасьвіць вецер і ганяецца за ўсходнім
ветрам, кожны дзень памнажае ілжу і спусташэньні;
заключаюць яны саюз з Асурам, і ў Егіпет вывозіцца
алей.
2 Але і зь Юдам у Госпада суд, - і Ён наведае Якава па
дарогах ягоных, аддасьць яму паводле дзеяў ягоных.
3 Яшчэ ў чэраве ў маці запыняў ён брата свайго, а
ўзмужнеўшы змагаўся з Богам.
4 Ён змагаўся з анёлам - і перамог; плакаў і благаў Яго;
у Віфляеме Ён знайшоў нас і там гутарыў з намі.
5 А Гасподзь ёсьць Бог Саваоф; Сутны - імя Яго.
6 Зьвярніся і ты да Бога твайго: назірай міласьць і суд
і спадзявайся на Бога твайго заўсёды.
7 Хананэянін зь няправільнымі вагамі ў руцэ любіць
крыўдзіць;
8 і Яфрэм кажа: «аднак я разбагацеў; назапасіў сабе
маёмасьці, хоць ва ўсіх маіх працах ня знойдуць
нічога незаконнага, што было б грэхам».

9 А Я, Гасподзь Бог твой ад самай зямлі Егіпецкай, зноў
пасялю цябе ў кушчах, як у дні сьвята.
10 Я гаварыў прарокам і памнажаў уявы і праз
прарокаў ужываў прытчы.
11 Калі Галаад зрабіўся Авэнам, дык яны сталі марныя,
у Галгалах калолі ў ахвяру цялят, і ахвярнікі іхнія
стаялі як крушні на межах поля.
12 Уцёк Якаў на палі Сірыйскія, і служыў Ізраіль за
жонку і за жонку вартаваў авечак.
13 Праз прарока вывеў Гасподзь Ізраіля зь Егіпта і праз
прарока Ён ахоўваў яго.
14 Моцна раздражніў Яфрэм Госпада, і за тое кроў яго
пакіне на ім і кляцьбу яго аберне Гасподзь на яго.

# Ас 13

1 Калі Яфрэм гаварыў, усе трапяталі. Ён быў высокі ў
Ізраілі; але зрабіўся вінаватым праз Ваала - і загінуў.
2 І сёньня дадалі яны да грэху: нарабілі сабе літых
ідалаў з срэбра свайго паводле разуменьня свайго, -
поўная праца мастакоў, - і кажуць яны людзям, якія
прыносяць ахвяру: «цалуйце цяльцоў!»
3 За тое яны будуць - як ранішні туман, як раса, што
скора зьнікае, як мякіна, што зьвяваецца з гумна, і як
дым з коміна.
4 Але Я - Гасподзь Бог твой ад зямлі Егіпецкай, - і ты
не павінен ведаць іншага бога апрача Мяне, і няма
Збаўцы апрача Мяне.
5 Я прызнаў цябе ў пустыні, у зямлі сасьмяглай.
6 Маючы палеткі, яны былі сытныя; а калі насычаліся,
дык узьвесялялася сэрца іхняе, і таму Яны забывалі
Мяне
7 І Я буду ім як леў, як ільвяня буду высочваць пры
дарозе.

8 Буду нападаць на іх, як пазбаўленая дзяцей
мядзьведзіха, разьдзіраць змесьцішча сэрца іхняга,
есьці іх там, як ільвіца; польныя зьвяры будуць ірваць
іх.
9 Загубіў ты сябе, Ізраіле, бо толькі ўва Мне - апора
твая!
10 Дзе цар твой цяпер? Хай ён ратуе цябе ва ўсіх
гарадах тваіх! Дзе судзьдзі твае, пра якіх казаў ты:
«дай нам цара і начальнікаў?»
11 І Я даў табе цара ў гневе Маім і забраў - у абурэньні.
12 Зьвязаны ў вузел беззаконьні Яфрэмава, захаваны
ягоны грэх.
13 Мукі парадзіхі спасьцігнуць яго; ён - сын
неразумны, інакш не стаяў бы доўга ў становішчы, у
якім нараджаюцца дзеці.
14 Ад улады пекла Я адкуплю іх, ад смерці выбаўлю іх.
Смерць! дзе твае джала? пекла! дзе твая перамога?
раскаяньня ў гэтым ня будзе ў Мяне.
15 Хоць Яфрэм пладавіты паміж братамі, але прыйдзе
ўсходні вецер, падымецца вецер Гасподні з пустыні, -
і высахне крыніца яго: ён спустошыць скарбніцу ўсіх
каштоўных сасудаў.

# Ac 14

1 Спустошана будзе Самарыя, бо паўстала супраць
Бога свайго: ад меча ўпадуць яны, дзеці іхнія будуць
разьбіты, і цяжарныя іхнія будуць расьсечаныя.
2 Зьвярніся, Ізраіле, да Бога твайго: бо ты ўпаў ад
бязбожнасьці тваёй.
3 Вазьмеце з сабою малітоўныя словы і зьвярнецеся да
Госпада; кажэце яму: «адбяры ўсякае беззаконьне і
прымі на дабро, і мы прынясём ахвяру вуснаў нашых.
4 Асур ня будзе ўжо ратаваць нас; ня будзем садзіцца
на каня і ня будзем болей гаварыць вырабу рук

нашых: багі нашыя; бо ў Цябе мілажальнасьць да сіротаў».
5 Улекую адпадзеньне іхняе, палюблю іх паводле
ўпадабаньня; бо гнеў Мой адвярнуўся ад іх.
6 Я буду расою Ізраілю; ён расьцьвіце, як лілея, і
пусьціць карэньне, як Ліван.
7 Расшырыцца гольле яго, - і будзе прыгажосьць
ягоная, як масьліны, і пахошчы ад яго, як ад Лівана.
8 Вернуцца тыя, якія сядзелі пад ценем ягоным,
будуць багатыя хлебам - і расьцьвітуць, як вінаградная лаза, славутыя будуць, як віно Ліванскае.
9 «Што мне яшчэ да ідалаў?» скажа Яфрэм. - Я пачую
яго і прыгледжу яго; Я буду як зялёны кіпарыс: ад Мяне будуць табе плады.
10 Хто мудры, каб разумець гэта? хто разумны, каб
спазнаць гэта? бо правільныя шляхі Гасподнія, і праведнікі ходзяць па іх, а беззаконныя загінуць на іх.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:
You include the above copyright and source information.
You do not use this work for commercial purposes.
Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 11 Nov 2022 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc